Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Крэўская сярэдняя школа»

# Лэпбук
# “Мая Радзіма – Беларусь”

Арцюкевіч Людміла Міхайлаўна,
настаўніца пачатковых класаў

Лэпбук “Беларусь – мая Радзіма” – гэта сучасны сродак навучання ў выглядзе кніжкі-раскладанкі, якая створана з мэтай выканання навучальных і гульнявых заданняў. На яго старонках размешчаны наступныя элементы: дыдактычныя гульні, практыкаванні, творы беларускіх пісьменнікаў, ілюстрацыі рамёстваў, якія адпавядаюць вучэбнай праграме і накіраваны на тое, каб прывіць вучням любоў да Радзімы, роднай мовы. Лэпбук мае практычнае значэнне. Ім могуць карыстацца вучні як індывідуальна, так і ў калектыўнай працы з педагогам. Лэпбук “Мая Радзіма − Беларусь” можа выкарыстоўвацца на вучэбных прадметах “Чалавек і свет”, навучанне грамаце (навучанне чытанню) у I класе.

Мэта: фарміраванне ў вучняў патрыятычных пачуццяў, любові да роднай прыроды, да гістарычнага мінулага, нацыянальнай культуры, развіццё асобасных якасцей вучня на аснове ўключэння яго ў сістэму сацыяльных зносін у розных гульнявых сітуацыях.

Задачы:

спрыяць фарміраванню нацыянальнальнай самасвядомасці вучняў, уяўленняў пра культурныя каштоўнасці, народныя святы, дзяржаўныя і прыродныя сімвалы Рэспублікі Беларусь;

ствараць умовы для выхавання пачуцця любові да роднага краю і гонару за яго.

Метадычны каментарый па выкарыстанні лэпбука “Беларусь – мая Радзіма”.

*Гульня “Беларускі нацыянальны касцюм”.*

Мэта. Фарміраванне ўяленняў аб прадметах беларускага нацыянальнага касцюма.

У ходзе гульні вучням прапануецца апрануць ляльку ў беларускі нацыянальны касцюм, расказаць пра яго асаблівасці, адзначыць элементы ўпрыгожвання касцюма.

*Практыкаванне “Простая беларуская ежа”*

Мэта. Фарміраванне ўяўленняў пра стравы нашых продкаў.

Вучні даведаюцца, што елі на снеданне нашы продкі, чым адрозніваюцца налісніκі ад тоўстых бліноў і як правільна рыхтаваць верашчаку.

*Дыдактычная гульня "Карта Беларусі".*

Мэта. Фарміраванне ўяўленняў аб геаграфічным размяшчэнні абласцей Рэспублікі Беларусь.

Гульня садзейнічае развіццю ўвагі вучняў, памяці, дробнай маторыкі рукі, уменню складаць цэлае з частак, фарміраванню ўяўленняў аб карце Рэспублікі Беларусь, абласных цэнтрах нашай краіны. У ходзе гульні вучням прапануецца з частак сабраць карту Беларусі і назваць абласныя цэнтры.

*Гульня "Сімвалы Беларусі".*

Мэта. Фарміраванне ўяўленняў аб прыродных сімвалах Беларусі, выхаванне патрыятычных пачуццяў. У ходзе гульні вучням прапануецца сабраць карцінку і назваць сімвал Беларусі.

*Практыкаванне "Народныя святы".*

Мэта. Фарміраванне ўяўленняў пра народныя святы беларусаў.

Вучням прапануецца стрэлкай паказаць народныя святы: Спас, Багач, Дзяды, Каляды, Масленіца, Гуканне вясны, Юр'е.

*Практыкаванне "Знакамітыя людзі Беларусі".*

Мэта. Фарміраванне ўяўленняў пра знакамітых людзей Беларусі.

Вучням прапануецца па картках называць знакамітых людзей Беларусі.

*Гульня "Традыцыйныя рамёствы Беларусі".*

Мэта. Развіццё ўяўленняў аб традыцыйных рамёствах беларусаў.

У ходзе гульні вучням прапануецца падабраць пэўнаму рамесніку вырабы, зробленыя ім.

*Раздзел "Вершы і загадкі на роднай мове".*

Мэта. Эмацыянальнае, пазітыўнае стаўленне да твораў мастацкай літаратуры і фальклору.

Вучням прапануецца праслухаць вершы беларускіх пісьменнікаў, адгадаць беларускія загадкі.